**Тэма:** ***Словы, якія адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?. Дапнута Бічэль “Белыя нівы…”***

**Мэты:**

- фарміраваць  уменне знаходзіць у тэксце словы- назвы прымет прадметаў;
- працаваць над узбагачэннем слоўнікавага запасу
- адпрацоўваць уменне устанаўліваць сувязь паміж словамі па пытаннях, правільна дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў;
- выхоўваць культуру вучэбнай працы, пазнавальную актыўнасць і самастойнасць.

Абсталяванне:

- карткі  для самастойнай работы з дыферэнцыраваннымі заданнямі;
- карткі са словамі-прыметамі для работы ў групах.

Ход урока

1. **Арганізацыйны момант.**

Увага! Празвінеў званок!
Ты гатоў пачаць урок?
Калі ў парадку твае рэчы,
Спадручней працаваць, дарэчы.

- З  якім настроем вы пачынаеце ўрок.
- **2. Лексічная размінка.**

  Якая пара года?
  Якія месяц?
  Першы месяц зімы?
  Другі месяц зімы?
  Трэці месяц зімы?
  Чаму яны так называюцца?
  Запішам гэтыя месяцы ў сшыткі.

**3.Актуалізацыя раней атрыманых ведаў.**

**Дзяўчынка**
**Дзень**
**Сонейка**
**Лясы**

Давайце паставім пытанні?
Што яны абазнчаюць?
Чаму дзяўчынка адказвае на пытанне хто?(абазначае жывыя прадметы)
На пытанне што? (нежывыя прадметы)

**4.Мэтаматывацыйны этап.**

**Гульня “Мадэльер”**

Давайце з вамі апранём нашы словы. Падбяром да іх словы, яктія будуць адказваць на прытанне які? Якая?..

Дзяўчынка (якая?) вясёлая

Дзень (які?) сонечны
Сонейка (якое?) яркае
Лясы (якія?) зялёныя

Што абазначаюць гэтыя словы? (прымету прадмета)

-Сёння мы з вамі пазнаёмімся са словамі, якія абазначаюць прымету прадмета, навучымся знаходзіць такія словы ў тэкстах, ужываць такія словы ў маўленні.
Для чаго нам патрэбны гэтыя словы? (яны робяць нашу мову прыгажэйшай)

**5. Вывучэнне новага м атэрыялу.**

**Адгарнём падручнік на с. 95 і прачытаем правіла.**

**6. Першаснае замацаванне.**
**Практыкаванне 143.**
Прачытаем верш.
Пра што гэты верш? (пра прыгажосць прыроды зімой)
Якія словы не зразумелыя?
Стрэхі – крыши,
Нівы – поля,
Хусціна – платок

Знойдзем словы, якія абазначаюць назвы прапдметаў (нівы, далі, бабы, вокны, стрэхі, хаціна, елка, хусціна)
А цяпер назавіце словы, якія адказваюць на пытанні які? якая? якія?
Выпішыц гэтыя словы па ўзоры

Дзеці, вы любіце зіму?
За што вы яе любіце?
Якія зімовыя забавы вы ведаеце? (за тое, што можна катацца на санках, ляпіць снегавікоў і г.д.)

**Практыкаванне 145.**
Які настрой у вершы?
Якія забавы ўпамінаюцца ў вершы? (санкі, лыжы, канькі)
Знайдзіце ў вершы словы, якія адказваюць на пытанні якеі, якая, якія?
Выпішыце словазлучэнні.

**Фізкультхвілінка**
*Гімнастыка для рук.*
-сціскание пальцаў у кулакі;
-імітацыя гульні на піяніна;

- стрэсці кісці рук.

<u>*Гімнастыка для вачэй.*</u>

- частае марганне;
- “стральба ” вачамі улева-управа, уверх-уніз, закрыць вочы.

Сшытак з нахілам пакладу,
Ручку правільна трымаю.
Сяду прама, не сагнуся,
за работу я вазьмуся.

**7. Замацаванне ведаў.**

Слоўнае маляванне.

Практыкаванне 153. Разгледзьце фотаздымак.

Раскажыце, як забаўляюцца дзеці зімолй?

Дайце дзецям імёны на фотаздымку.

Складзіце па ім тры сказы, каб у іх былі словы, якія адказваюць на пытанні які? якая? якія? Падкрэсліце словы-прыметы хвалістай лініяй

**8. Кантрольна-ацэначны этап**

**Дыферэнцыраваныя заданні. Самастойная работа. (карткі)**

Падбяры да назваў прадметаў назвы прымет. Злучы стрэлкай.

| | |
|---|---|
| агурок | чырвоны |
| памідор | дробны |
| гарох | зялёны |
| лімон | кіслы |
| возера | шырокае |
| поле | глыбокае |
| зіма | ясны |
| дзень | марозная |

<u>*Дадатковае заданне.*</u>

Пастаў пытанні да слоў-назваў прымет.

Заяц (         )  шэры, вавёрка (       ) рыжая, вожык (       ) калючы, пчолкі (      ) працавітыя.

-Вызнач па прыметах прадметы і запішы іх назвы.

Зялёная, пушыстая......
Стройная, кучаравая.......
Лясное,глыбокае ........
Магутны, густы .......
*( возера, елка, бяроза, дуб)*

<u>*Дадатковае заданне.*</u>

Пастаў пытанні да слоў-назваў прымет.

Заяц (         )  шэры, вавёрка (       ) рыжая, вожык (       ) калючы, пчолкі (      ) працавітыя.

**9. Дамашняе заданне.**
На выбар.

- пр.154, выпісаць словы, якія адказваюць на пытанні які, якая .

**10.Падвядзенне выніка ўрока. -**
- На якія пытанні адказваюць словы-назвы прымет прадметаў?
- Чаму новаму навучыліся на ўроку?
- Для чаго неабходны ў мове словы-прыметы?
**11.Рэфлексія.**
- Пакажыце, з якім настроем заканчваеце ўрок?
*Зараз скончыцца ўрок.*
*Пакладзі хутчэй дружок,*
*У партфель усё хутка,лоўка-*
*Кнігу, сшытак і алоўкі....*